

# Таццяна Кухаронак: *Этнаграфія выбрала мяне*

Таццяна Кухаронак нарадзілася ў сёмы дзень апошняга летняга месяца – у самы разгар жніва, часу руплівага і клопатнага, але ў той жа час – сонечнага і багатага. Такім стала і наступнае жыццё. З важкім плёнам кніг, артыкулаў, фільмаў, што паўставалі са стараннай і адказнай працы. Таццяна Іванаўна – кандыдат гістарычных навук, ужо больш за 50 гадоў працуе ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук. І мае агульны бібліяграфічны спіс не ў адну сотню навуковых прац, сярод якіх 5 кніг і дзясяткі раздзелаў у калектыўных манаграфіях, анталогіях, зборніках.

Такая ўрадлівая творчая ніва Таццяны Іванаўны мела сваім пачаткам, як і належыць, дзяцінства. Нарадзілася яна ў вёсцы Клінок Чэрвеньскага раёна ў вясковай беларускай сям'і з традыцыйным укладам, размеркаваннем мужчынскай і жаночай працы, метадамі, сродкамі і прыёмамі выхавання дзяцей. І, як лічыць яна сама, усе найлепшыя рысы свайго характару, светаўспрымання, адносін да людзей, да жыцця сфарміраваліся ў дзяцінстве, у сям'і. Яшчэ дзіцем Таццяна прайшла шматлікія «класы» працоўнага выхавання, спасцігла і «лясную навуку» збіраць грыбы і ягады.

Але чаму этнаграфія? Чаму выбрала менавіта гэтую прафесію? Я задала гэтае пытанне наўпрост. Адказ не тое каб расчараваў ці здзівіў, але падвёў да вельмі істотнай думкі: пра наканаванне, абранасць, перадвызначанасць. Таццяна Іванаўна адказала:

– *Гэта этнаграфія выбрала мяне, а не я яе.*

І працягнула:

– *Такі быў збег абставін, што пасля школы ў 1971 г. мяне прынялі на пасаду лабаранта ў сектар этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, які тады ўзначальваў светлай памяці Васіль Кірылавіч Бандарчык – легендарны беларускі гісторык і этнограф. Першыя месяцы я там нават дыхаць баялася, успрымала будынак з калонамі як святое месца, храм навукі. Паступіла вучыцца на вячэрняе аддзяленне філфака БДУ імя У.І. Леніна, хоць, начытаўшыся кніжак у школе, планавала паступаць на юрыдычны факультэт БДУ, каб змагацца са злачынцамі. Натуральна, я туды не паступіла, нягледзячы на тое, што атрымала на ўступных экзаменах тры пяцёркі і адну чацвёрку. Нездарма ж сцвярджаюць мудрацы, што ўсё выпадковае – заканамерна, а ўсё заканамернае – выпадкова. Я вырасла і жыла ў стыхіі народнай культуры дзіцём, падлеткам, у раннім юнацтве: умывалася чырвоным яйкам на Вялікдзень, цягала вароты ад суседзяў на Шчодры вечар, употай хадзіла з бабуляй на могілкі на Радаўніцу, вучылася жаць і слухала бабуліну песню: «А я ў полі жыта жала, / Свякрухачка с печы ўпала, / Усю крапівачку зламала, / Ой, не жаль мне свякрухачкі, / А жаль мне крапівачкі…». Было дзіўна і смешна крыху. Была на вясковым вяселлі, на пахаванні, дзе чула галашэнні. Любіла танцаваць і спяваць розныя танцы і песні, у тым ліку і народныя.*

Вось вам і фундамент для будучага фалькларыста і этнографа, бо наша дзяцінства – крыніца ўсіх жыццёвых сіл, жаданняў, планаў, здзяйсненняў.

Пара маленства, што і заканамерна, стала і першай навуковай зацікаўленасцю маладога этнографа. І першы поспех – манаграфія «Радзінныя звычаі і абрады беларусаў» (1993) належыць да ліку самых цытаваных беларускіх кніг у славянскім нарадазнаўстве. Тут сабраны палявыя этнаграфічныя запісы пра радзінную абраднасць з усіх рэгіёнаў нашай краіны, прадстаўлены ўласныя запісы з амаль 150 вёсак. Пазней гэтая тэма атрымала годнае падагульненне ў акадэмічным томе з серыі «Беларуская народная творчасць» «Радзіны. Абрад. Песні» (1998). Увогуле, да тэмы «Традыцыйная культура і дзеці» даследчыца ніколі не была абыякавай, у тым ліку пры выкладанні народнай педагогікі будучым настаўнікам, у артыкулах і выступленнях.

У 2017 г. выходзіць кніга «Радзіны і маленства ў традыцыйнай культуры беларусаў». Тут новы палявы матэрыял і паказальныя ілюстрацыі, а таксама, што надзвычай важна, зусім прыдатныя для сённяшняга дня парады. Наогул, як даводзіць Таццяна Іванаўна, менавіта звычаі радзіннага цыклу выяўляюць надзвычайную ўстойлівасць у часе, атрымліваюць развіццё нават у межах гарадской культуры, хоць і захоўваюць архаічны светапоглядны фундамент.

Навуковы даробак Таццяны Кухаронак прыцягвае жывым арыгінальным матэрыялам і пазнавальным, даступным стылем выкладання. У поле ўвагі трапляні рэгіянальныя асаблівасці вясельнай абраднасці, гаворка пра якія – у калектыўнай працы «Беларусы. Т. 5. Сям'я», грамадскія традыцыі («Беларусы. Т. 6. Грамадскія традыцыі»), дзе даследаваны эвалюцыя сямейнай і каляндарнай абраднасці беларусаў, яе лакальныя і арэальныя ўласцівасці. Таццяна Кухаронак разам з іншымі аўтарамі дзесяцітомнага выдання «Беларусы» – супрацоўнікамі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – уганаравана прэміяй «За духоўнае адраджэнне» (2008 г).

Заўважнай з'явай у навуковай прасторы Беларусі стала манаграфія «Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў» (2001), дзе прадстаўлена ўся палітра каляндарнага пераапранання. Перад чытачом паўстаюць і каляндная Каза, і Жораў, і Мядзведзь, і Цыган з Доктарам, і Смерць з Дзедам ды Бабай, і яшчэ шэраг іншых масак-персанажаў, семантыка якіх падаецца ў кантэксце ўсяго каляндарна-абрадавага гадавога кола. Аўтар не проста зводзіць

разам усе магчымыя даныя аб гэткай карнавальнай прасторы народных святаў, але і разважае аб іх магчымым уключэнні ў культурныя практыкі сучаснасці. Нездарма ў кнізе змешчаны дадатак, у якім сабраны сцэнары абрадавых святаў, распрацаваных у розных дамах культуры.

Беларускую маску Т. Кухаронак прадставіла на пачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя ў час прэстыжнага навуковага форуму «Карнавал і маскі народаў свету» ў Бельгіі (г. Бэнш), куды давялося – з вялікімі прыгодамі – везці з сабою сапраўдны кажух для маскі казы.

Тацццяна Іванаўна Кухаронак на сёння – самы абазнаны і паважаны даследчык нашай каляндарнай абраднасці. Пацверджаннем таму – раздзелы ў пяці важкіх тамах з серыі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (2004–2013) і сумесная з Т. Валодзінай кніга «Ядраное жыта гаспадара кліча…»: каляндарны год у абрадах і звычаях» (2015 г.) у толькі заснаванай навукова-папулярнай серыі выдавецтва «Беларуская навука» «Традыцыйны лад жыцця». Такая ўвага да календара адпавядае той ролі, якую гэтыя абрады ў сваіх аўтэнтычных формах працягваюць адыгрываць у культуры сучасных вяскоўцаў. Даследчыца падае каляндар як арганічны сплаў двух светапоглядаў – царкоўна-хрысціянскага і ўласна народнага, у вытоках – міфалагічнага. З увагай ставіцца яна і да праваслаўнай, і да каталіцкай традыцыі. Народны каляндар і цяпер выконвае ролю жыццёвай асновы вясковага соцыуму, своеасаблівага стрыжня, на якім трымаецца сялянскі ўклад жыцця з рэгламентаваным рытмам працы і адпачынку, сплеценым з рытмамі прыроды. Напрацоўкі Таццяны Іванаўны паслядоўна ды метадалагічна дакладна канстатуюць не толькі дасканаласць і мастацкую каштоўнасць аўтэнтычнага фальклору Беларусі ў мінулым, але і яго някепскую захаванасць ды вялікі сацыяльна-культурны патэнцыял для сучаснасці.

Веды пра каляндарныя звычаі даследчыца знайшла магчымасць данесці да самых маленькіх чытачоў – у 2023 г. выходзіць для вучняў і дзяцей малодшага ўзросту кніжачка («Святочны калейдаскоп. Беларускія народныя традыцыі». Навукова-папулярнае выданне. Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Мінск: «Адукацыя і выхаванне») на беларускай і рускай мовах, якая была перавыдадзена ў 2024 г.

Гуманістычны патэнцыял, актуальнасць і, так бы мовіць, практычнасць аўтэнтычнага фальклору Таццяна Кухаронак імкнецца ўвасабляць у жыццё, рэальную дзейнасць культурных устаноў і вясковы побыт. У сярэдзіне 90-х яна збірала фальклорны матэрыял на Капыльшчыне, у тым ліку і пра цароў-калядоўшчыкаў. З ініцыятывы даследчыцы мясцовыя жыхары загарэліся ідэяй аднавіць абрад, і ў 1996 г. на стары Новы год адбыўся сапраўдны цуд. Да вяскоўцаў прыйшлі калядныя героі іх продкаў: Цары, Мамай, Механоша і Дзед з Бабай. У 1997-м Таццяна Кухаронак разам са здымачнай групай Белвідэацэнтра (рэжысёр – Ірына Волах) знялі кінастужку «Калядныя цары», распачаўшы цыкл відэафільмаў «Беларускі народны каляндар». Аўтэнтычнасць і непаўторнасць абраду была адзначана ў кастрычніку 2009 г., калі «Калядныя цары» рашэннем сакратарыята чацвёртай сесіі Міжурадавага камітэта па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны былі ўключаны ў Спіс тэрміновай аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Вяскоўцы і зараз з удзячнасцю і цеплынёй узгадваюць тыя першыя сустрэчы з зацікаўленай збіральніцай.

Менавіта Таццяне Іванаўне належыць самае заўважнае месца ў заснаванні экраннага фонду этнаграфічнай спадчыны беларусаў. Разам з Беларускім відэацэнтрам ёю знята і складзена цэлая кінематаграфічная калекцыя, дзе сваё кінаўвасабленне атрымаў народны земляробчы каляндар. На рэальным матэрыяле жывых традыцый створаны фільмы «Хрэсьбіны» (1995), «Калядныя цары» (1997), «Эй, гуляю я» (1998), «Зажынкі, дажынкі» (2001), «Сёмуха» і «Мікола зімовы» (2003), «Шчодры вечар» (2004), «Масленіца» (2005), «Купалле» (2005), «Вялікдзень» (2006), «Дзяды. Радаўніца» (2006), «Юр'я» (2007), «Тры каралі. Вадохрышча» (2011), дзе Т. Кухаронак выступіла ў якасці сцэнарыста і навуковага кансультанта. Кожны фільм прысвечаны аднаму асобнаму святу і паказвае яго не ў «тэатралізаваным» варыянце, а ў жывым бытаванні. Здымкам папярэднічала вялікая пошукавая праца па назапашванні звестак, калі часам літаральна па крупінках выцягвалі інфармацыю са старэйшых носьбітаў мясцовых традыцый. І гэтая актывізацыя вёскі, раёна не праходзіла бясследна: свята набывала сваё другое жыццё.

Цыкл відэафільмаў «Беларускі народны каляндар» даў цэласнае, комплекснае ўяўленне пра традыцыйныя каляндарныя святы беларусаў як найважнейшую сферу жыццядзейнасці нашага народа. Дакументальная сапраўднасць і глыбокае разуменне ўнутранай логікі народнага свята забяспечылі гэтым фільмам ролю залатога фонда візуальнай этнаграфіі. Для Беларусі гэтая галіна была на той час новым міждысцыплінарным кірункам, які патрабаў нестандартных методык з выка-

рыстаннем, з аднаго боку, ведаў этналагічнай навукі, а з другога – кінематографа з яго спецыфікай. Вельмі важна, што Таццяна Іванаўна і яе суаўтары-кінематаграфісты напачатку працы абралі належную методыку, у аснову якой была пакладзена рэпрэзентацыя культуры самімі носьбітамі, давер да аўтэнтычнага матэрыялу, дзе сутнасць і прызначэнне кіно як метада этналагічнага даследавання заключалася ў пазнанні самой асновы культуры, яе ядра, яе архетыпа.

Былі і іншыя выніковыя праекты, дзе Таццяна Іванаўна ўзяла самы дзейсны ўдзел. Да прыкладу, распрацоўка навуковага абгрунтавання памятных манет Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь у серыях «Святы і абрады беларусаў» і «Сямейныя традыцыі славян» (выпушчана 8 манет: «Каляды», «Масленіца»; «Вялікдзень», «Сёмуха», «Купалле», «Спасы», «Багач», «Дзяды»; «Вяселле», «Хрэсьбіны», «Наваселле», «Паўналецце»). Усе гэтыя манеты карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў нашай краіне і за мяжой. Выніковым стаў і ўдзел у падрыхтоўцы серыі выданняў беларускага фальклору ў перакладах на англійскую і кітайскую мовы.

Творчы і навуковы шлях Таццяны Іванаўны – ці не найлепшы прыклад практычнай і грамадскай дзейнасці па захаванні традыцыйнай культуры. Яна не проста брала ўдзел у журы шматлікіх фальклорных фестываляў і конкурсаў, але ўсёй сваёй душой уключалася ў працэс і перажывала за ўдзельнікаў, асабліва малодшых, за справу, яе працяг. У свой час Таццяна Іванаўна з'яўлялася кіраўніком прэс-цэнтра Першага Міжнароднага фестывалю фальклору на Беларусі (Пінск – Мінск, 1994), які стаўся найвялікшай падзеяй у культурным жыцці нашай краіны.

Таццяна Кухаронак неаднаразова судзіла танцавальныя конкурсы, бо і сама ўмее добра танцаваць і любіць народны танец. Як пасля яна распавядала, «такой напружанай дзейнасцю нідзе і ніколі болей не займалася, столькі эмоцый адначасова нідзе болей не перажывала»:

*– Танец цягнецца паўтары-дзве хвіліны, скачуць пяць-шэсць пар адначасова, пяцібальная сістэма ацэнак ад 1 да 5 – і ты імгненна павінен падняць ацэнку кожнай пары. Асабліва цяжка было ацэньваць малодшых удзельнікаў, калі на цябе з мальбой і жахам адначасова глядзяць гэтыя шчырыя вачаняты… З нямым пытаннем – за што? Рыхтуючыся працаваць у танцавальным журы, я перачытала ўсю літаратуру па традыцыйных танцах, а пасля яшчэ пайшла практычна займацца танцамі, вучылася на курсах Мікалая Аляксеевіча Козенкі. Скажу шчыра, што ацэньваць – «журыць», як жартуюць сябры, – танцавальныя пары хоць надзвычай адказна і складана, але значна лягчэй, чым самой танчыць «Каханачку», «Матлёт», «Мікіту», нават улюбёную «Польку».*

Без перабольшанняў, менавіта Таццяна Іванаўна – сёння адзін з самых адданых і эфектыўных этнографаў-палевікоў. Цяжка адшукаць тыя раёны ў Беларусі, дзе б хоць аднойчы не пралягалі яе экспедыцыйныя дарожкі. Шмат і шмат разоў мы ездзілі разам, і я назірала высокапрафесійныя здольнасці весці інтэрв'ю, што спалучалася з яе чалавечым уменнем нязмушанага і цёплага кантакту з субяседнікам. І амаль кожнага разу – шчырыя гутаркі, якія насычалі далёка не толькі новай інфармацыяй, але і новымі ўражаннямі, суперажываннем, датычнасцю да народнай культуры. «Бабкатэрапія» – жартам і ўсур'ёз называе Таццяна такія візіты. Яна ўсім сэрцам любіць сваю малую радзіму, бацькаўшчыну, традыцыйную культуру беларусаў ва ўсіх яе праявах, і гэтая любоў узаемная.

Усё жыццё Таццяны Кухаронак праходзіць у Акадэміі навук Беларусі, дзе жыццёвыя сілы і здольнасці былі аддадзены не толькі навуковай дзейнасці. Будучы «гарманічна развітой асобай», Таццяна шмат гадоў уваходзіла ў склад акадэмічнай зборнай валейбольнай каманды, разам з якой заваявала нямала ўзнагародаў на спаборніцтвах рознага ўзроўню для сваёй арганізацыі. Пазней перайшла на гульню ў шашкі – і зноў перамогі!

Акрамя ўсяго, Таня была і застаецца надзвычай таварыскім і вясёлым чалавекам з тонкім пачуццём гумару і нязменнай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу. Сябры і калегі шчыра віншуюць Таццяну Іванаўну і сардэчна зычаць ёй новых здзяйсненняў, радасці і здароўя.

Таццяна ВАЛОДЗІНА

